Маліся за нас, Святая Багародзіца!

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.04.2018 00:00



Хутка распачнецца марыйны месяц май. У святынях, ля прыдарожных крыжоў і каплічак можна будзе пачуць Ларэтанскую літанію – найпрыгажэйшы гімн ушанавання Маці Божай. Вернікі збяруцца на малітве разам, каб праслаўляць цноты і прывілеі, якімі Бог надзяліў Марыю. Адным з месцаў, дзе ў маі можна будзе пачуць гімн ушанавання Маці Божай, з'яўляюцца прыдарожныя каплічкі. Яны вырастаюць з рэлігійнай традыцыі мясцовых жыхароў і сведчаць аб іх моцнай веры. Але акрамя таго, што прыдарожныя каплічкі – бачны знак Божай прысутнасці, гэта яшчэ і элемент культуры, які шмат што можа распавесці пра паселішча і яго абывацеляў.

Жаданне маліцца разам

Прыдарожныя каплічкі – гэта невялікія культавыя пабудовы, якія існуюць амаль у кожнай мясцовасці. Так, калі святыні паблізу не было, яны ўзводзіліся з той мэтай, каб тамтэйшыя жыхары, якія не заўсёды мелі магчымасць дабрацца да касцёла, маглі збірацца разам у канкрэтным месцы на супольную малітву. † У некаторых мясцовасцях пэўны чалавек званіў у невялікі звон, які знаходзіўся паблізу каплічкі, запрашаючы астатніх на маёвае або ружанцовае набажэнства. Але, як правіла, людзі мелі для гэтага вызначаны час, і звон быў больш неабходны для таго, каб паведамляць жыхарам, што хтосьці адышоў па ўзнагароду да Пана. І тады вернікі пакідалі на некалькі хвілін усе свае справы, каб адгаварыць у інтэнцыі памерлага "Вечны супакой…". Па традыцыі па дарозе на могілкі пахавальная працэсія заўсёды спынялася ля крыжа і каплічкі, каб развітацца з памерлым, які назаўсёды адыходзіць з вёскі.

Асабліва шмат вернікаў збіралася ля прыдарожных каплічак з нагоды важных рэлігійных свят. Менавіта там праз даязджаючага святара асвячаліся стравы на велікодны стол. Такая практыка існуе і сёння.

Падчас урачыстасці Божага Цела каплічкі былі і з'яўляюцца алтарамі, да якіх скіроўваецца працэсія з Найсвяцейшым Сакрамантам. Менавіта ад іх распачынаецца шлях пілігрымаў да святых месцаў. Многія прыходзяць сюды за бласлаўленнем Маці Божай перад дальняй дарогай.

Упрыгожаныя сэрцамі

Маліся за нас, Святая Багародзіца!

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.04.2018 00:00



